9. Там же. С. 670.
10. Там же. С. 663.
11. Там же. С. 672.
12. Там же. С. 662.
13. Пичета В. И. Scoriniana (1776—1926) // Белоруссия и Литва XV—XVI вв. / под ред. З. Ю. Копысского, В. Д. Королюка, Н. И. Улащика. М. : Изд-во АН СССР, Ин-т славяноведения. 1961. С. 731—788.
14. Пичета В. И. Культура Белоруссии в XVI—XVII вв. С. 661.
15. Там же. С. 676.
16. Пичета В. И. Возрождение Украины-Руси и Белой Руси в XVI — начале XVII вв. С. 721.
17. Пичета В. И. Культура Белоруссии в XVI—XVII вв. С. 688.
18. Там же. С. 688.
19. Там же. С. 684.
20. Там же. С. 689.
21. Там же. С. 689.
22. Там же. С. 689.
23. Пичета В. И. История белорусского народа. Минск : Изд-во БГУ, 2003. 230 с.
24. Пічэта У. І. Беларускае Адраджэнне ў XVI сталецці // Чатырохсотлецце беларускага друку : зб. навук. арт. / выд. АН БССР ; пад навук. рэд. У.І. Пічэта. Мінск, 1926. С. 132—156.
25. Пичета В. И. Культура Белоруссии в XVI—XVII вв. С. 691.
26. Там же. С. 697.
27. Там же. С. 695.
28. Там же. С. 693.
29. Там же. С. 695.
30. Там же. С. 697.

УДК 94(474.5)

**М. М. Забаўскі**
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», Мінск*
**Л. В. Нікалаева**
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі», Мінск*

# НАРАТЫЎНЫЯ КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫ І ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XIV — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI СТ.

**Уводзіны.** З атрыманнем Рэспублікай Беларусь дзяржаўнага суверэнітэту значна абудзілася цікавасць да разнастайных пытанняў нацыянальнай гісторыі. Асаблівую ўвагу даследчыкаў выклікалі аспекты існавання дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі. Натуральная зацікаўленасць была выказана і да праблем гісторыі Вялікага Княства Літоўскага (далей — ВКЛ), федэратыўнай поліэтнічнай дзяржавы, у стварэнні, існаванні і развіцці якой адну з асноўных роляў адыграў беларускі этнас, фарміраванне якога адбывалася ў яе межах. Вялікую папулярнасць атрымалі пытанні палітычнага жыцця ВКЛ, у тым ліку яго знешняй палітыкі. Таму зварот да праблематыкі знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV — першай паловы XVI ст. нам падаецца актуальным, бо яна па-ранейшаму застаецца мала распрацаванай.

**Асноўная частка.** Цікавасць да стану крыніц па знешнепалітычнай праблематыцы таксама трэба прызнаць цалкам зразумелай і своечасовай. Гэта тлумачыцца не толькі натуральным імкненнем пазнаваць уласную мінуўшчыну, але і станам сучаснага крыніцазнаўства, у якім да нашага часу назапасілася дастатковая колькасць даследаванняў праблемы і, разам з тым, захоўваюцца пэўныя супярэчнасці і лакуны. Нягледзячы на тое, што здабыткі айчыннай і замежнай гістарычнай навукі ў выданні і перавыданні крыніц па знешнепалітычнай гісторыі ВКЛ вызначанага перыяду з'яўляюцца досыць сціплымі, у архіўных сховішчах маецца дастаковая база крыніц па праблеме, здольная стаць самастойным аб'ектам даследавання.

Сярод апублікаваных крыніц, якія могуць выкарыстоўвацца пры даследаванні праблемы знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV — першай паловы XVI ст., важную ролю маюць крыніцы наратыўнага характару (апавядальныя гістарычныя крыніцы). Сярод іх найбольш важнае значэнне займаюць гістарыка-літаратурныя аповеды з пагадовай формай выкладання матэрыялу — летапісы і хронікі, якія адрозніваюцца вялікай дэталёвасцю апісання падзей у адпаведнасці з пэўнай гістарычнай канцэпцыяй. Часта іх аўтары не проста рэгістравалі факты, але і імкнуліся даць ім уласную інтэрпрэтацыю. У наратыўных крыніцах нярэдка сустракаюцца фактычныя недакладнасці, а часам і наўмыснае скажэнне падзей, аднабокія меркаванні і адзнакі [1, с. 3—4]. Апошняе надае гэтым крыніцам пэўны элемент суб'ектыўнасці, што таксама трэба ўлічваць у ходзе працы з імі.

Як адзначаюць даследчыкі, характэрнай рысай летапісання на беларускіх землях у XV—XVI стст., па меншай меры да канца XV ст., з'яўляўся яго агульнадзяржаўны (агульнарускі) характар, імкненне вывесці гісторыю ВКЛ, асабліва «рускай» часткі яго зямель, ад Старажытнарускай дзяржавы. Дадзеная з'ява непасрэдна была звязана з першапачатковымі поспехамі вялікіх князёў літоўскіх у ажыццяўленні «агульнарускай» палітыкі па збіранні так званых рускіх зямель. Гэта давала і тлумачэнне наймення «літоўска-рускія летапісы» [2, с. 87]. Цяпер найбольш пашырана назва «беларуска-літоўскія летапісы», прапанаваная ў свой час М. М. Улашчыкам і трапіўшая на старонкі энцыклапедый [3]. У апошні час намецілася тэндэнцыя да ўвядзення назвы «беларускія летапісы» [4, с. 192—193].

© Забаўскі М. М., Нікалаева Л. В., 2016



Рэпазітарый БарГУ

Летапісы і хронікі, створаныя на беларускіх землях у XV—XVI стст., захаваліся больш чым у 20 спісах. Даследчыкамі былі прапанаваны некалькі іх класіфікацый. У залежнасці ад памераў тэксту летапісаў іх прапаноўвалася падзяляць на кароткія і падрабязныя. Адпаведна з другім пунктам гледжання, выдзяляюцца тры рэдакцыі беларуска-літоўскіх летапісаў: кароткая, пашыраная і поўная [5]. У наш час большасць даследчыкаў пагаджаюцца з канцэпцыяй беларускага вучонага В. Чамярыцкага, які абгрунтаваў існаванне трох асобных летапісных зводаў, першыя два з якіх дайшлі да нас у складзе некалькіх спісаў. У адпаведнасці з яго меркаваннем, у аснову першага беларуска-літоўскага летапіснага зводу, складзенага каля 1428—1430 гг. у Смаленску, лёг «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», першая арыгінальная спроба кароткай гісторыі беларускіх і літоўскіх зямель, і маскоўскі летапіс мітрапаліта Фоція, які быў пакладзены ў аснову агульнай часткі «Беларуска-літоўскага летапісу 1446 года», дапоўненыя пазней гістарычнымі запісамі да 1446 г. уключна [6]. Асновай другога беларуска-літоўскага летапіснага зводу стала «Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага», створаная ў 1520-я гг. Адным з адрозненняў трэцяга беларуска-літоўскага летапіснага зводу з'яўляецца тое, што ён захаваўся толькі ў адзіным спісе, вядомым под назвай «Хроніка Быхаўца» [7]. Датаванне гэтага помніка па-ранейшаму застаецца прадметам дыскусіі, найбольш верагодная — 60-я гг. XVI ст. [8].

Беларуска-літоўскія летапісы ўтрымліваюць багаты матэрыял па гісторыі розных сфер жыцця грамадства беларускіх зямель канца XIV — першай паловы XVI ст., у тым ліку гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ. Яны асвятляюць стасункі ВКЛ з Вялікім княствам Маскоўскім, напрыклад, ход маскоўска-ліцвінскіх войн на мяжы XV—XVI стст. і ў першай палове XVI ст., даюць інфармацыю аб ўзаемаадносінах ВКЛ з Крымскім ханствам, Вялікай (Заволжскай) Ардой, Каралеўствам Польскім, Малдаўскім княствам, Лівонскім і Тэўтонскім ордэнамі, Ноўгарадам і Псковам у перыяд іх самастойнага існавання. Беларуска-літоўскія летапісы даюць магчымасць паглядзець на вывучаемыя падзеі з ліцвінскага пункту гледжання.

У спісах першага летапіснага зводу (Нікіфараўскі, Акадэмічны, Супрасльскі, Слуцкі летапісы [9]) яскрава прадстаўлена апалогія палітычных дзеянняў вялікіх князёў літоўскіх, перш за ўсё Вітаўта, у асяроддзі якога вялася падрыхтоўка напісання зводу і былі створаны некаторыя творы, якія пазней сталі крыніцамі ці састаўнымі часткамі беларуска-літоўскіх летапісаў першага зводу. У іх падаецца гісторыя ВКЛ, прасякнутая ідэяй абароны яго дзяржаўных і палітычных інтарэсаў, імкненнем паказаць вялікіх князёў літоўскіх толькі ў прывабным святле, акрэсліць правы ВКЛ на некаторыя тэрыторыі, напрыклад Падолле, якое ў момант стварэння зводу трапіла под кантроль палякаў.

Як адзначае В. Чамярыцкі, у творах першага беларуска-літоўскага летапіснага зводу адлюстраваны і ідэалагічна абгрунтаваны імкненні і погляды перадавых грамадскіх сіл ВКЛ, яго палітычнай і інтэлектуальнай эліты таго часу, якая падтрымлівала велікакняжацкую ўладу ў барацьбе з феадальнай раздробленасцю за палітычнае адзінства і магутнасць дзяржавы. Акрамя таго, у XV ст. якасна змяніўся і характар жанру беларуска-літоўскіх летапісаў. Спецыфічнай яго асаблівасцю стала спалучэнне традыцыйнай, пагадовай формы выкладання з прагматычным, звязным апавяданнем пра мінулае, кароткіх дакументальных запісаў-паведамленняў з гістарычнымі аповесцямі, сухой інфармацыі пра падзеі з жывым, белетрыстычным іх апісаннем. Пад уплывам дзелавой пісьменнасці быў выпрацаваны своеасаблівы стыль беларускіх летапісаў — лаканічны, выразны, дзелавы [10].

Няўдачы вялікіх князёў літоўскіх у ажыццяўленні «агульнарускай» праграмы і пераход з канца XV ст. ініцыятывы ў збіранні «рускіх» зямель да Вялікага княства Маскоўскага не засталіся незаўважанымі летапісцамі і паўплывалі на змену канцэпцыі афіцыйнай гісторыі ВКЛ, што трапіла на старонкі беларуска-літоўскіх летапісаў, якія ў XVI—XVIII стст. называліся ўжо пераважна хронікамі [11]. У канцы XV ст. пачалася перапрацоўка першага летапіснага зводу. Рабілася гэта з мэтай абгрунтавання і падкрэслівання асобнай ад Вялікага княства Маскоўскага гісторыі ВКЛ, а таксама яе своеасаблівай вестэрнізацыі. Прыкладзеныя намаганні знайшлі адлюстраванне ў другім беларуска-літоўскім летапісным зводзе, атрымаўшым назву «Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага». Яе асноўнай крыніцай стаў першы летапісны звод, у прыватнасці «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», які быў дапоўнены легендарнымі і выдуманымі сведчаннямі аб пачатковай гісторыі ВКЛ (да Гедзіміна), а таксама звесткамі па гісторыі ВКЛ за другую палову XV — першую палову XVI ст. Ідэалагічнай задачай, якая стаяла перад складальнікамі другога звода, з'ўлялася імкненне падкрэсліць спрадвечнае багацце, магутнасць і аўтарытэт ВКЛ, звязаць генеалогію вялікіх князёў літоўскіх, а разам з імі і некаторых родаў літоўскай знаці, напрыклад, Гаштольдаў і Гальшанскіх, з асяроддзя якіх, як мяркуюць даследчыкі, паходзілі стваральнікі новай канцэпцыі, з рымскай арыстакратыяй. Тым самым рэдактары другога зводу намагаліся паказаць, што дынастыя вялікіх князёў літоўскіх і гісторыя ВКЛ у цэлым вядзецца з Рыма, з захаду. З'яўленне ў складзе другога зводу літаратурна апрацаванай легенды пра рымскае паходжанне кіруючай у ВКЛ дынастыі Гедзімінавічаў і вядучых літоўскіх магнацкіх родаў павінна было падкрэсліць перавагу радавітасці літоўскай шляхты ў параўнанні з польскай, а таксама абавергнуць распаўсюджаную ў Еўропе легенду аб нізкім паходжанні дынастыі вялікіх князёў літоўскіх [12]. Гэта быў своеасаблівы адказ на спробы знешнепалітычных праціўнікаў паставіць пад сумненне легітымнасць кіруючай у ВКЛ дынастыі і дзейсны сродак пазбавіць і маскоўскі, і польскі бакі аргумента для абгрунтавання сваіх прэтэнзій на землі ВКЛ.

Другі беларуска-літоўскі летапісны звод прадстаўлены цэлым шэрагам спісаў: летапісамі Рачынскага [13], Румянцаўскім [14], Еўраінаўскім [15] і інш. [16]. Пераважна яны дайшлі да нас у складзе рукапісаў другой паловы XVI—XVII стст. Адносна праблематыкі знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV — першай паловы XVI ст. у іх ёсць некаторыя цікавыя падрабязнасці, якія асвятляюцца з мясцовых, патрыятычных пазіцый з негатыўным стаўленнем да Вялікага княства Маскоўскага, але яны змяшчаюць шмат памылак, ненадзейная і іх храналогія.

Чарговым этапам эвалюцыі летапісання ў ВКЛ стаў трэці летапісны звод, ці «Хроніка Быхаўца» [17]. Твор атрымаў сваю назву ад прозвішча памешчыка А. Быхаўца, у бібліятэцы якога ў маёнтку Магілёўцы Ваўкавыскага

Рэпазіторый БарДУ

павета Гродзенскай губерні ў 1820-я гг. быў выяўлены адзіны вядомы даследчыкам спіс летапісу, арыгінал якога быў страчаны ў другой палове XIX ст. [18, с. 720]. «Хроніка Быхаўца» асвятляе гісторыю ВКЛ ад легендарных часоў (пры гэтым пачатак падзей перанесены ў параўнанні з другім летапісным зводам з I у V ст., з часоў Нерона ў эпоху Вялікага перасялення народаў) да 1506 г. Яе каштоўнасць як крыніцы па гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV — першай паловы XVI ст. заключаецца ў тым, што тут утрымліваюцца арыгінальныя звесткі (складзеныя на аснове назіранняў, успамінаў храніста ці удзельнікаў падзей і г. д.) за другую палову XV — пачатак XVI ст. Самай каштоўнай з'яўляецца заключная частка «Хронікі», за 1453—1506 гг., якая складае каля палавіны тэксту, дзе змяшчаецца, у прыватнасці, падрабязны аповяд пра ваенныя дзеянні на маскоўска-ліцвінскай мяжы ў 1500—1501 гг., апісанне бітвы на рацэ Вядрошы 1500 г., звесткі пра набегі татараў і бітву з імі пад Клецкам у 1506 г. ліцвінскага войска на чале з князем М. Л. Глінскім [19, с. 164—173]. Аўтар «Хронікі» вызначаўся выразнай антыпольскай пазіцыяй. У творы выявіліся імкненні і меркаванні патрыятычна настроенай часткі мясцовай шляхты, заклапочанай будучыняй сваёй краіны.

Палітычнай гісторыі ВКЛ аддавалі даніну ўвагі і польскія гісторыкі XV—XVI стст. У ліку першых трэба назваць «Гісторыю Польшчы» Яна Длугаша, напісаную ў 12 кнігах у 1455—1480 гг. Кнігі 10—12 ахопліваюць гісторыю эпохі кіравання дынастыі Ягелонаў. Праца Я. Длугаша багатая звесткамі па знешнепалітычнай гісторыі ВКЛ, змяшчае інфарацыю аб ваеннай барацьбе і дыпламатычных статунках з татарамі, Тэўтонскім і Лівонскім ордэнамі, Вялікім княствам Маскоўскім, Польшай, Малдаўскім княствам [20, с. 591—592]. Пазіцыю аўтара характарызуе негатыўнае стаўленне да самастойнасці ВКЛ. Ён разглядае ўсю гісторыю Польшчы як праслаўленне сваёй радзімы і прыклад служэння дзяржавы каталіцкай царкве і яе задачам. Працы ўласціва пэўная тэндэнцыйнасць, калі Я. Длугаш дзеля доказу сваіх тэзісаў вельмі вольна абыходзіцца з крыніцамі, то замоўчваючы факты, якія яны паведамляюць, але не ўпісваюцца ў яго схемы, то скажаючы звесткі крыніц, часам да супрацьлеглага. Таксама ён часта падвойваў факты: адна падзея, зафіксаваная рознымі крыніцамі пад рознымі гадамі, ці нават у адной крыніцу двойчы, ператваралася ў Длугаша ў два асобныя факты. З другога боку, у сваім імкненні да дакладнасці ён часта дадаваў да інфармацыі крыніц цэлы шэраг новых падрабязнасцей, імён, лічбаў, падзей, кіруючыся толькі сваімі здагадкамі. Аднак гэтыя недахопы не змяншаюць велізарнага значэння яго працы, як найбольш значнага помніка польскай сярэднявечнай гістарыяграфіі, у якім з вялікай стараннасцю сабраныя ўсе даступныя тады сведчанні пра мінулае Польшчы і дзяржаў, якія яе акружаюць, і пакладзены пачатак яе сістэматызаванай гісторыі.

З замежных крыніц у даследаванні па гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV — першай паловы XVI ст. можа быць выкарыстана апошняя частка лацінамоўнай «Хронікі» Бернарда Вапоўскага, што ахоплівае 1480—1535 гг. [21]. Гэта арыгінальная частка твора, каштоўная цікавымі апісаннямі падзей, якія мелі непасрэднае дачыненне да знешняй палітыкі ВКЛ. Сярод іх войны з Вялікім княствам Маскоўскім, мяцеж князя М. Л. Глінскага, супрацоўніцтва ліцвінскіх і польскіх ваяроў пры абароне паўднёвых межаў дзяржаў ад набегаў турак і татараў і г. д. Храніст пераасэнсаваў працэсы польска-ліцвінскіх узаемаадносін у больш цярпімым да ВКЛ ключы, чым гэта адзначана ў Я. Длугаша. У пэўнай ступені гэта тлумачыцца з'яўленнем пры двары караля польскага і вялікага князя літоўскага Казіміра Ягайлавіча вялікай групы ліцвінскіх арыстакратаў, уплыў якіх выявіўся ў спробах храніста выказаць і ліцвінскае разуменне падзей.

Асаблівае значэнне мае «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» М. Стрыйкоўскага [22], упершыню выдадзеная ў Караляўцы (Кёнігсбергу) у 1582 г. У працы даволі падрабязна разглядаецца гісторыя ВКЛ ад легендарнага князя Палямона да часоў кіравання Стэфана Баторыя (апавяданне вядзецца да 1580 г.). «Хроніка» мае шмат недакладнасцей і памылак, што тлумачыцца некрытычным стаўленнем аўтара да выкарыстаных крыніц. Нягледзячы на кампілятыўны характар, яе каштоўнасць узмацняецца тым, што аўтару ўдалося выкарыстаць многія мясцовыя крыніцы, у тым ліку тыя, што не дайшлі да нашага часу: беларуска-літоўскія летапісы, рукапісы і дакументальныя матэрыялы з архіваў Хадкевічаў, Алелькавічаў, Гедройцаў [23, с. 82—129].

У якасці крыніцы пры вывучэнні пытанняў знешняй палітыкі ВКЛ можа быць выкарыстаны твор мемуарнай літаратуры — успаміны аўстрыйскага дыпламата Сігізмунда Герберштэйна «Запіскі об Маскоўскіх справах» [24]. Гэта адно з найбольш поўных і дакладных апісанняў Маскоўскай дзяржавы XVI ст. і суседніх з ёю краін і народаў Усходняй, Цэнтральнай, часткова Паўночнай Еўропы і Азіі (у асноўным Заўралле і Заходняя Сібір). Аўтар — вопытны аўстрыйскі дыпламат, які больш за 50 год быў на службе імператараў Свяшчэннай Рымскай імперыі германскай нацыі з дынастыі Габсбургаў, якія з'яўляліся канкурэнтамі прадстаўнікоў кіруючаў у той час у Польшчы і ВКЛ дынастыі Ягелонаў у барацьбе за троны Чэхіі і Венгрыі. Апошнія акалічнасці прадвызначылі пэўную антыпольскую і антылітоўскую скіраванасць выкладання дыпламата. Габсбургі двойчы — у 1517 і 1526 гг. — пасылалі С. Герберштэйна ў якасці пасрэдніка на перамовах дарадчыкаў вялікага князя маскоўскага Васіля III і паслоў караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта I. У час падарожжа С. Герберштэйн занатоўваў звесткі па самых розных пытаннях — ад звычаяў і побыту да палітыкі і эканомікі. У нарысе, які прысвечаны гісторыі Маскоўскай дзяржавы, ён закрануў пытанне ўзаемаадносінаў Вялікага княства Маскоўскага з ВКЛ. Для «Запісак» характэрна імкненне ўзвялічыць Вялікае княства Маскоўскае, даказаць беспадстаўнасць прэтэнзій ВКЛ на «рускія» землі. Акрамя таго, у працы змешчаны звесткі пра К. І. Астрожскага, падаецца падрабязнае апісанне падзей паўстання князя М. Л. Глінскага, маюцца звесткі аб асабістым лёсе апошняга. Ёсць ва ўспамінах аўстрыйскага дыпламата і цэлая глава, якая прысвечана геаграфічна-гісторыка-эканамічнаму апісанню ВКЛ, якая так і называецца «Аб Літве» [25]. Нягледзячы на палітычную тэндэнцыйнасць і пэўныя недакладнасці ў выкладанні матэрыялу, успаміны С. Герберштэйна — каштоўная гістарычная крыніца першай паловы XVI ст.

Імкненне да сістэматызацыі ведаў, практычнага вопыту прывяло да павелічэння колькасці такога віду нарратыўных крыніц, як трактаты. Цікавыя звесткі па знешнепалітычнай праблематыцы, асабліва тыя, што асвятляюць



Рэпазіторый БарДУ

адносіны ВКЛ з Вялікай і Перакопскай (Крымскай) ордамі, змяшчаюцца ў «Трактаце аб дзвюх Сарматыях» Мацея Мяхоўскага [26], які ўпершыню з'явіўся ў друку ў 1517 г., праз тры гады пасля захопу Смаленска войскамі Вялікага княства Маскоўскага (1514 г.). Гэта палітычная падзея паказала, што новая прыбаўка да тытула маскоўскага вялікага князя — «государь всея Руси» — не проста словы, а рэальная праграма стварэння велізарнай дзяржавы. Сярод характэрных рыс названай крыніцы, указвае А. Гейштар, можна назваць непасрэднае назіранне, як крыніцу геаграфічнага і этнаграфічнага апісання, прыцягненне сведчанняў па гісторыі нашэсцяў і перасяленнЯ народаў для тлумачэння актуальнага становішча рэчаў (не без памылак і промахаў), канцэнтрацыя ўвагі на дзвюх буйных дзяржавах — Асманскай імперыі і Вялікім княстве Маскоўскім і г. д. [27, с. 32].

Трактат — гісторыка-геаграфічная праца. Ён дастаткова багаты і аб'ектыўна каштоўнымі сведчаннямі, нягледзячы на шэраг несумненна памылковых паведамленняў. М. Мяхоўскі расказвае не толькі пра мінулае, але часта і пра сучаснае для яго, вядомае з непасрэдных назіранняў. Яго сведчанні асабліва цікавыя і каштоўныя, як першакрыніца.

Як крыніца ў даследаванні знешнепалітычнай праблематыкі гісторыі ВКЛ могуць быць выкарыстаны і фрагментаы (іх захавалася 10) з трактата Міхалона Літвіна «Аб норавах татар, літоўцаў і масквіцян» [28]. Доўгі час сапраўднае імя аўтара заставалася прадметам дыскусіі. У дарэвалюцыйнай расійскай, а потым і савецкай гістарыяграфіі аўтарства прыпісвалася Міхаілу Тышкевічу [29, с. 87—96]. Але ў 70-я гады XX ст. польскі гісторык Ежы Ахманьскі на аснове комплекса прыкмет, што характарызавалі аўтара, а таксама сведчанняў іншых крыніц, пераканаўча даказаў, што аўтарам мог быць толькі Венцэслаў Мікалаевіч (1490—1560 гг.), літовец па паходжанні, католік па вераспавяданні, лацінскі сакратар велікакняжацкай канцылярыі ў 1534—1542, 1547—1555 гг., як неаднаразова выконваў дыпламатычныя даручэнні [30, с. 97—117].

Трактат — палемічны твор і крыніца па гісторыі грамадскай думкі ВКЛ сярэдзіны XVI ст. Але ён утрымлівае звесткі і аб ранейшых падзеях, дае ім ацэнку з пункту гледжання наступнага пакалення, па-свойму тлумачыць прычыны ваенных няўдач ВКЛ у стасунках з Вялікім княствам Маскоўскім і крымскімі татарамі, характэрных для перыяду канца XV — першай паловы XVI ст. Трактат — своеасаблівая спроба ўздзейнічаць на манарха і грамадскае меркаванне ВКЛ, каб павысіць яго абароназдольнасць з боку як Крымкага ханства, так і Рускай дзяржавы, якая пачала складвацца ў той час. У цэлым твор з'яўляецца цікавай аўтэнтычнай крыніцай.

**Заключэнне.** Пры распрацоўцы праблемы знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV — першай паловы XVI ст. ёсць магчымасць абаперціся на значны аб'ём разнастайных наратыўных крыніц, якія дазваляюць раскрыць змест і сутнасць асноўных кірункаў знешняй палітыкі ВКЛ, а таксама вызначыць сам механізм знешнепалітычнай дзейнасці.

### Спіс цытуемых крыніц


1. Михайловская Л. Л. Белоруссия и Литва конца XIV — первой трети XVI в. (по материалам хроники Бернарда Ваповского) : дис. … канд. ист. наук: 07.00.02. Минск, 1981. 216 с.
2. Ходзін, С. Летапісанне на Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 1997. № 2. С. 81—93.
3. Назаров В. Д. Летописи белорусско-литовские // Большая советская энциклопедия. М. : Совет. энцикл., 1973. Т. 14. Куна — Ломами. С. 385 : ил. ; Чамярыцкі, В. Летапісы беларуска-літоўскія // Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. Мінск : БелЭн, 2006. Т. 2. Кадэцкі корпус ─ Яцкевіч. С. 192.
4. Чамярыцкі В. Летапісы беларускія // Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. Мінск : БелЭн, 2006. Т. 2. Кадэцкі корпус — Яцкевіч. 792 с.: іл.
5. Ходзін С. Летапісанне на Беларусі. С. 91.
6. Чамярыцкі В. Летапісы беларускія. С. 192.
7. Там жа. С. 192—193.
8. Ходзін С. Летапісанне на Беларусі. С. 91.
9. Там жа. С. 87.
10. Чамярыцкі В. Летапісы беларускія. С. 192.
11. Там жа. С. 192.
12. Ходзін С. Летапісанне на Беларусі. С. 89.
13. Летопись Рачинского // Полное собрание русских летописей. М.: Наука, 1980. Т. 35 : Летописи белорусско-литовские. С. 164─172.
14. Румянцевская летопись // Там же. С. 212—213.
15. Евреиновская летопись // Там же. С. 234—238.
16. Полное собрание русских летописей. М. : Наука, 1980. Т. 35 : Летописи белорусско-литовские. 306 с.
17. Хроника Быховца // Полное собрание русских летописей. М. : Наука, 1975. Т. 32 : Хроники: Литовская и Жемойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного. С. 128—173.
18. Чамярыцкі В. Хроніка Быхаўца // Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. Мінск : БелЭн, 2006. Т. 2. Кадэцкі корпус — Яцкевіч. 792 с. : іл.
19. Хроника Быховца. С. 164—173.
20. Семянчук А. Длугаш Ян // Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. Мінск : БелЭн, 2005. Т. 1. Абаленскі — Кадэнцыя. 688 с. : іл.
21. Wapowski B. Kroniki Bernarda Wapowskiego z Radochoniec kantora katedr. krakowskiego. Cześć ostatnia czasy podługoszowskie obejmująnca (1480 — 1535 // Scriptores rerum Polonikarum. Kraków : druk. uniw. Jagiel., 1874. T. II: Continet: Chronikorum Bernardi Vapovii partem posteriorem 1480—1535. S. 1—256.
22. Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Żmudzka i wszystkiej Rusi. Warszawa : Nakł. G. L. Glucksberga, 1846. T. 1. 440 s. ; T. 2. 572 s.
23. Улащик Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания / отв. ред. В. И. Бутанов ; АН СССР. Ин-т истории СССР. М. : Наука, 1985. 261 с.
24. Герберштейн С. Записки о Московии / пер. с нем. А. И. Малеина, А. В. Назаренко; вступ. ст. А. Л. Хорошкевич; под ред. В. Л. Янина. М. : Изд-во МГУ, 1988. 430 с.
25. Там жа. С. 185—193.
26. Меховский М. Трактат о двух Сарматиях / введ., пер. и коммент. С. А. Аннинского, вступ. ст. Б. Грекова. Л. : Тип. им. Володарского, 1936. X, 288 с.
27. Гейштор А. История на службе юго-восточной политики Речи Посполитой в XV и XVI в // Россия, Польша и Причерноморье в XV—XVIII вв. / под ред. Б. А. Рыбакова. М. : Наука, 1979. С. 29—39.


Репозиторий БарГУ

28. Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян / пер. В. И. Мотузовой, вступ. ст. М. В. Дмитриева, И. П. Старостиной, А. Л. Хорошкевич, коммент. С. В. Думина [и др.] М. : Изд-во МГУ, 1994. 151 с.
29. Юргинис Ю. М. Посольство Михаила Литвина у Крымского хана в 1538—1540 гг.// Россия, Польша и Причерноморье в XV—XVIII вв. / под ред. Б. А. Рыбакова. М. : Наука, 1979. С. 87—96.
30. Охманьский Е. Михалон Литвин и его трактат «О нравах татар, литовцев и москвитян» середины XVI в. // Россия, Польша и Причерноморье в XV—XVIII вв. / под ред. Б. А. Рыбакова. М. : Наука, 1979. С. 97—117.

УДК 94

**Ю. С. Клещёва**
*Государственное учреждение образования «Гимназия № 1 г. Барановичи», Барановичи*

# СУДЬБА, ЗАКАЛЁННАЯ ВОЙНОЙ: АЛЕКСЕЙ ЕФИМОВИЧ КЛЕЩЁВ, ОРГАНИЗАТОР ПИНСКОГО ПАРТИЗАНСКОГО ДВИЖЕНИЯ

**Введение.** Всё дальше и дальше в историю уходит героическая эпопея Великой Отечественной войны — самой жестокой из всех войн, которые пережила наша страна. Однако, чтобы не допустить ошибок прошлого, мы, правнуки современников тех трагических времён, должны помнить и чтить уроки истории и сохранять память о наших героических предках.

**Основная часть.** Великая Отечественная война началась в результате нападения Германии на Советский Союз и со стороны белорусского народа носила характер освободительной борьбы против агрессоров. В соответствии с планом войны против СССР под кодовым названием «Ост» Германия планировала произвести чистку населения Восточной Европы и СССР в рамках более глобального нацистского плана по «освобождению жизненного пространства» для немцев и других «германских народов» за счёт территории «низших рас», таких как славяне.

Копий плана не сохранилось, однако его основные детали восстановлены. Согласно плану славяне, живущие в странах Восточной Европы и европейской части СССР, должны были подвергнуться частичной германизации, а частично быть депортированы за Урал или уничтожены. Предполагалось оставить небольшой процент местного населения для использования в качестве бесплатной рабочей силы для немецких колонистов. По расчётам нацистских чиновников, через 50 лет после войны число немцев, проживающих на этих территориях, должно было достигнуть 250 млн. План относился ко всем народам, проживающим на территориях, подлежащих колонизации [1, с. 51].

Важный вклад в победу над немецко-фашистскими захватчиками внесли белорусские партизаны. Уже в конце 1942 г. под контролем партизан находилось 30% оккупированной территории Беларуси, а к концу 1943 г. 59% нашей земли были полностью свободны от противника. Сопротивление оккупантам стало носить организованный характер, проходило под руководством Центрального и Белорусского штабов партизанского движения. Поддержку Беларуси оказывали неоккупированные районы Советского Союза. С «большой землёй» была налажена постоянная авиасвязь. Белорусские партизаны получали продовольствие, боеприпасы и вооружение, другие необходимые средства. Участники белорусского Сопротивления нанесли значительный урон противнику: партизаны вывели из строя сотни тысяч гитлеровцев, разгромили 948 штабов и гарнизонов, подбили 1 355 танков и бронемашин. Широкий масштаб имели операции партизан по массовому разрушению железнодорожных коммуникаций на оккупированной территории. Всего за годы войны под откос было пущено более 11 тыс. немецких эшелонов. В условиях постоянной угрозы жизни сражались с оккупантами в подполье около 70 тыс. человек. Подпольщики проводили сбор сведений о противнике, антифашистскую агитацию, диверсии. Члены подпольной организации Минска при содействии партизан уничтожили генерального комиссара Беларуси В. Кубе. Имея в виду значение сопротивления оккупации в Беларуси, его называли «3-м фронтом» борьбы с фашистской агрессией, а Беларусь — республикой-партизанкой [2].

Одним из ярких представителей партизанского сопротивления был мой прадедушка Алексей Ефимович Клещёв. Родился он в бедной крестьянской семье 25 февраля 1905 г. в деревне Михновичи ныне Калинковичского района Гомельской области. В юношеские годы учился в железнодорожном училище, сельскохозяйственной школе, работал в хозяйстве отца. Свой самостоятельный трудовой путь начал в 1924 г. секретарём, а затем председателем Беседского сельсовета Копаткевичского района. Алексей Ефимович с задором собирал вокруг себя актив, много внимания уделял проведению собраний крестьян, деятельности комиссий сельского Совета, закреплению депутатов за населёнными пунктами. Под его руководством проводились мероприятия по землеустройству, внедрению многопольных севооборотов, кооперативному строительству.

Когда гитлеровская Германия вероломно напала на СССР, Алексей Ефимович остался на оккупированной территории для руководства подпольной партийной работой и организации партизанского движения. А. Е. Клещёв придавал особое значение воспитанию бойцов и командиров партизанских отрядов, принимал непосредственное участие в разработке и осуществлении всех крупных боевых операций. Пинское соединение нанесло ряд мощных ударов по коммуникациям оккупантов. Только с мая по ноябрь 1943 г. было пущено под откос 109 воинских эшелонов противника, разгромлено 10 вражеских гарнизонов в Любешево, Лахве, Микашевичах, Лунино, взорвано 38 мостов.

© Клещёва Ю. С., 2016

Репозиторий БарГУ